Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

СЬЦЯГ ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністр.: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з даставкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 5 Вільня, Аўторак 17-га ліпня 1928 г. Год 1

Па загаду Старосты Гродзкага на м. Вільню канфіскаваны № 4 газэты „Сьцяг Працы" за перадавіцу „Адналіты фронт сялян і работнікаў бяз розьніцы нацыянальнасьцяў", карэспандэнцыі — „Спадар „працуе", і „Камандант любіцца, а сялянам сьпіна трашчыць", а таксама за заметкі з хронікі—„Перамога бастуючых" і „Лясныя пажары".

Што перад намі?

Стыхійныя няшчасьці пранясьліся над нашай зямелькай. Цяжкая зіма, яшчэ горшая вясна, халады, дажджы, ураганы, — падарунак прыроды, які моцна б'ець па дабрабыту селяніна, руйнуючы і без таго заняпалую гаспадарку. Трудна прадбачыць, што далей чакае беларуса, якія няшчасьці гатуе капрызная прырода.

Але, відаць, аднэй стыхійнай бяды мала.

Насуваецца чорная хмара над нацыянальнай беларускай культурнай нівай, а значыць і над будучыняй.

Гэтыя хмары, што сунуцца на нас, яскрава азначаныя і выяўленныя ў палітычным жыцьці Соймавай адзінкай носяць назоў *рэгіяналізма.*

За падставу рэгіяналізму бярэцца праца сярод насельніцтва на „крэсах" у галінах гаспадарча-грамадзкай і культурна асьветнай. Калі бліжэй прыгледзецца да мэтадаў гэтае працы, лёгка заўважыць, што тут ходзіць аб адарваньні сялянства ад культурна-нацыянальнага адраджэньня, і пад тым ці іншым відам здэнацыяналізаваць яго, а калі гэта ня ўдасцца, то паставіць на беларускім целе кляймо ўтраквізму.

Жаданьне адарваць масы ад працоўнай інтэлігенцыі, ад таго культурнага слою, які разам з народам носіць у сабе ідэю адраджэньня і вызваленьня, — гэта стары прыём, — стары, як сама буржуазія. Так было калісь, так ёсьць і цяпер.

Рэгіяналістам хочацца запрагчы масы ў сваю таратайку, якою па сутнасьці будзе кіраваць „лукавая" і панурая цень Станіслава Грабскага. А дзеля таго, што працоўную сялянскую масу ня можна ўжо адарваць ад свайго культурнага асяродка, ад інтэлігенцыі трэба спадзявацца, што пачнецца „ўсуваньне" гэтага асяродку свайго народу з падсоўваньнем замест здаровага нацыянальнага зьместу, дэнацыяналізатарскіх ідэяў. Частка інтэлігенцыі будзе куплена і выкарыстана рэгіяналістамі, каб дэнацыяналізаваць беларуса, тая-ж частка, якая будзе вясьці змаганьне за сваі нацыянальныя і сацыяльныя ідэалы, за лепшае заўтра свайго народу, напэўна будзе „ізалявана".

Міласьці рэгіяналізму на падставе поўнай эканамічнай залежнасьці селяніна, зруйнаванага вайной і няшчасьцямі, будаваць сваю апеку над нашым жыцьцём і праводзіць дэнацыяналізацыю краю. Для гэтай мэты магчыма, што пацякуць са скарбу народныя грошы, а для людзкага вока, каб паказаць „вялікадушнасьць" рэгіяналістаў, кінуць народу, як жабраку якому, пару скалечаных беларускіх школаў, і на гэтым скончацца дасягненьні беларускіх прыхільнікаў рэгіяналізму.

Аб шчырасьці рэгіяналістаў у адносінах да беларускага школьніцтва можа сьведчыць хоць-бы той факт, што на адным з „рэгіянальных" паседжаньняў віленскіх і навагрудзкіх паслоў і сэнатараў з „адзінкі" пастаноўлена "ўпаньствовіць" Віленскую і Навагрудзкую Гімназіі, што раўназначна з здэнацыяналізаваньнем іх, а Клецкую і Радашкаўскую Гімназіі дык зусім зьнішчыць, боператварыць іх на пачаткавыя, або прафэсыянальныя школы.

Гэты красамоўны факт сам за сябе гаворыць.

Рэгіяналізм на нашых землях — гэта старая спроба, выказаная польскім шавінізмам яшчэ ў папярэднім Сойме,— спроба гаварыць з беларускім народам праз голавы прадстаўнікоў і павадыроў народных.

Але занадта народ наш сьвядомы і асьцярожны, каб лятуценьні рэгіяналістаў збыліся. Народ пэўны сваіх сілаў і верыць, што ніхто ня дасьць нам вызбаўленьня, і што трэба спадзявацца толькі на свае ўласныя сілы.

Урадавы крызіс у Югаславіі.

„Радыкальны" ўрад Югаславіі падаўся ў адстаўку.

4 ліпня — гістарычны дзень у Югаславіі: зьненавіджаны ня менш, як „лібэральны" ўрад у Румыніі, „радыкальны" ўрад у Югаславіі падаўся ўрэшце ў адстаўку. Габінэт Вукічэвіча вышаў у адстаўку, калі ня толькі партыя ўмераных дэмакратаў, уваходзіўшых у склад ураду і ўжо неаднойчы адклікаўшая з габінэту сваіх міністраў, зрабіла ізноў рашучую пастанову — трэбаваць адстаўкі ўраду,—але калі ўжо і значныя групы „адналітых" яшчэ нядаўна „радыкалаў" пачалі адкалывацца ад урадавага масыву гэтай сэрбскай „эндэцыі".

Былы прэм'ер заявіў журналістам, што кароль прыняў адстаўку габінэту, даручыўшы ўсім міністрам сядзець на сваіх фатэлях, пакуль ня будзе створаны новы ўрад. Палітычныя колы Югаславіі цьвердзяць, што ня можна хутка спадзявацца зложэньня новага ўраду. Бо-ж павадыр Харватаў Сьцяпан Радзіч, які мае прыняць можа найвыдатнейшае ўчасьце ў стварэньні новага габінэту, яшчэ-ж ня так хутка вернецца да поўнага здароўя.

Прэм'ерам будучага ўраду называюць сучаснага міністра заграмічных спраў Марынкавіча. Новы ўрад мае мець характар парляманцкай канцэнтрацыі (зложаны па магчымасьці з усіх партыяў сойму). Харвацкія павадыры маюць паставіць варункам свайго ўваходу ў склад ураду — дамаганьні рашучага перагляду канстытуцыі „Сэрба-Харвата-Славенскага Каралеўства"—у напрамку перабудовы яго на запраўдную фэдэрацыю самастойных краёў і народаў — з уласнымі соймамі і ўласнай адміністрацыяй.

Спробы стварэньня новага ўраду.

Кароль запрапанаваў стварыць урад старому старш. „радыкал. клюбу" пас. Станаевічу, але той ня прыняў прапазіцыі — з прычыны труднасьці паразумецца з апазіцыяй. Станаевіч згадзіўся толькі на ролю пасрэдніка паміж партыямі — у мэтах стварэньня канцэнтрацыйнага габінэту. Пасьля адмовы Станаевіча кароль запрасіў да сябе мін. Марынкавіча, з якім вёў нараду. Спадзяюцца, што Марынкавічу ўдасцца зложыць патрэбны ўрад.

П. Станаевіч заявіў журналістам, што справа ратыфікацыі трактату ў Нэттуна — роўна цяжкая, як патрэбная. Мы ведаем, чаму. — Бо — за яе заграмічны капітал, трэбуючы яе як плату за пазыку для Югаславіі; проці яе — апазіцыя, якая пагражае народнымі разрухамі!... Станаевіч дадаў, што стварыць новы ўрад, пабудаваны на паразуменьні між урадавай большасьцяй і апазіцыяй, таксама цяжка, як — расьпісаць цяпер новыя выбары — у часе такога хваляваньня ў краі. Дык, відаць—за ратыфікацыю Нэттунскага трактату прыдзецца сэрбам заплаціць сваім харвацкім ды славянскім „малодшым братом" рашучымі ўступкамі ў справе аўтаноміі іх краёў.

Кароль даручае місыю Радзічу.

5 ліпня, пасьля адмовы старшыні Станаевіча, кароль запрасіў да сябе павадыра апазіцыі харвацкага барацьбіта Сьцяпана Радзіча — у справе стварэньня ўраду.

Радзіч ня мог яшчэ пакінуць ложка, дык дэлегаваў замест сябе другога павадыра апазіцыі, старшыню клюбу „незалежных дэмакратаў" Прыбічэвіча, які і перадаў Радзічу даручэньне караля. У той-жа вечар Радзіч адказаў каралю, што вельмі здаволены даверыем караля, хоча шчыра зрабіць усё, каб спыніць барацьбу паміж харватамі і сэрбамі. Але прыняць на сябе стварэньне ўраду **ў сучасных варунках** ня можа: 1—таму, што яшчэ хворы, а 2, — таму, што ня можа мець асабістых стасункаў з сучаснай большасьцяй парляманту. Радзіч — праз Прыбічэвіча — дадаў каралю, што ўзяў-бы на сябе стварэньне толькі тымчасовага „чыноўніцкага" (непалітычнага) ураду, які меў-бы адну толькі задачу — правясьці **новыя выбары**. А ўжо новы парлямант мог-бы вырашыць усе палючыя справы, а перадусім — зьмяніць канстытуцыю, ператварыўшы Югаславію ў запраўдную фэдэрацыю самастойных краёў і народаў.

Урадавы крызіс у Югаславіі завастраецца.

Адмова Радзіча прыняць учасьце ў стварэньні новага ўраду—пры тым-жа складзе парляманту — выклікала значнае завастрэньне крызісу ў Югаславіі.

Уся Харватыя пастанавіла актыўна падтрымаць дамаганьне свайго павадыра — аб расьпісаньні новых выбараў. У Загрэбе адбыліся грозныя дэманстрацыі. У гмаху даўнейшага харвацкага Сойму (які пры нямецка-аўстрыяцкай уладзе існаваў, а „француска-сэрбская" скасавала дарэшты)... сабраліся павадыры харвацкіх незалежніцкіх партыяў, якія пастанавілі — цалком аддзяліцца ад Белграду. Белградзкая прэса зьмяшчае заяву Радзіча, у якой павадыр умеранага кірунку харвацкіх самастойнікаў, нядаўні незалежнік-рэспубліканец, ня так даўно прызнаўшы караля і супольную з сэрбамі дзяржаўнасьць, ізноў з сумам сьцьвярджае, што — „аздараўленьне ўсей Югаславіі, гэта—задача, якая вышэй людзкіх сілаў... Дык харваты думаюць толькі аб тым, каб запэўніць свайму краю чым больш волі і дабрабыту — пад пануючай цяпер дынастыяй"... Сэрбская прэса тлумачыць гэтую заяву, як адмову харватаў ад супрацоўніцтва ў тварэньні супольнай дзяржаўнасьці С. Х. С. каралеўства ды абмяжаваньнем дзяржаўнай працы харватаў межамі свайго краю. Белгразкая „радыкальная" прэса бачыць у заяве Радзіча, спрытны манэўр харвацкага павадыра, якім той хоча пастрашыць публічную апінію каралеўства, каб змусіць уладу яго да безадкладнага роспуску Сойму.

Але-ж пэўне, — заява гэта зьмяшчае яўную пагрозу павароту ізноў Радзіча і яго групы да сэпаратызму (да аддзяленьня ад Югаславіі) і імкненьня да незалежнасьці Харватыі ад яго найпаважнейшая ў Харватыі палітычная партыя нядаўна адмовілася.

Пакуль-што кароль робіць чарговыя спробы выхаду з крызісу, даручаючы па чарзе стварыць урад — то павадыру славянскіх каталікоў Карошэцу, то старшыні клюбу басьнякоў-мусульман, доктару Спаго

Кароль лічыць, што не на часе цяпер—пры такім напружаньні ў краі — рабіць новыя выбары.

7 ліпня кароль запрасіў да сябе павадыроў усіх партыяў, з якімі доўга вёў нараду, на якой быццам выявілася надзея на блізкі канец крызісу.

Павадыр сэрбскіх „незалежных дэмакратаў" (не ўрадавых) Прыбічэвіч і таварыш Радзіча па кіраўніцтву апазіцыйным „сялянска-дэмакратычным блёкам", заявіў, што ён ня прымаў учасьця ў нарадзе павадыроў партыяў у караля, але толькі высьвятліў — ад імя апазіцыі — каралю яе становішча.

Ён заявіў, што апазіцыя зусім не выступае проці дзяржаўнага адзінства Югаславіі, але дамагаецца рашучай зьмены адміністрацыйнай сыстэмы і будовы дзяржавы, якая можа быць праведзена шляхам легальнай зьмены канстытуцыі.

Радзіч з сям'ёй выехаў у Загрэб.

Ня гледзячы на забарону дактароў (дый пэўне-ж — проці „радаў" улады)... Радзіч з сям'ёй выехаў 8 ліпня ў Загрэб, сталіцу сваей Харватыі.

Як данасілі газэты, у Загрэбе любімаму павадыру падрыхтавана ўрачыстае спатканьне.

Кароль узяў да сябе дзяцей забітага Радзіча.

Як ведама, Галоўная ўправа харвацкай сялянскай партыі адмовілася прыняць ад ураду ўсялякія адшкадаваньні за забітых сэрбскім эндэкам дэпутатаў-харватаў, заявіўшы, што сям'і іх знойдзе срэдзтва забясьпечыць сам харвацкі народ. Але кароль усё-ж хоча шляхотна і спрытна выкарыстаць факт забойства для зблізжэньня, але не для раз'яднаньня двух братніх народаў — сэрбскага і харвацкага. Каб прыхіліць да сябе харватаў, ён заявіў удаве па Павалу Радзічу, што бярэ да сябе — у сваю сям'ю — 2 яе дзяцей — дзяўчынку і хлапца — і будзе апякавацца імі, як роднымі, на ўсё жыцьцё. Удава Радзічава згадзілася аддаць дзяцей каралю.

Новы нямецкі „сацыялістычна-пацыфістычны" урад і спатканьне яго у колах францускіх мілітарыстаў.

3 ліпня новы нямецкі ўрад стаў перад парлямантам. Новы канцлер Нямецкай Рэспублікі тав. Гэрман Мюллер прачытаў дэклярацыю новага ўраду, выясьніў праграму яго будучай працы.

Зьмест гэтай праграмавай дэклярацыі такі.

Наўперад канцлер сцьвердзіў, што рэспубліканскі фундамэнт Нямеччыны настолькі ўжо сільны і ўтрывалены, што цяпер сталай працай нямецкага ўраду і нямецкага народу зьяўляецца—далейшая разбудова гмаху новай Рэспублікі,—у галіне сацыяльнага і палітычнага поступу.

Але першай чарговай задачай ураду зьяўляецца ліквідацыя ўсіх пасьледзтваў вайны, лячэньне ўсіх пакінутых ёй ранаў, а найгалаўнейшай з якіх усьцяж астаецца акупацыя нямецкай зямлі войскамі былых ворагаў.

Сцьвердзіўшы становуча мірную волю нямецкага народу ды вырачэньне Нямеччыны ўсякай думкі „рэваншу" (помсты за паражэньне ды імкненьне да адабраньня сваіх былых земель шляхам новай вайны), канцлер заявіў, што гэта дае Нямеччыне права трэбаваць сабе сярод іншых дзяржаваў поўнай раўнапраўнасьці. Толькі гэты варунак дасьць магчымасьць Эўропе спакойна ўмацоўваць мір і шчыра працаваць над агульным поступам сьвету.

На шляху да гэтага раўнапраўя ды мірнай працы, ды адбудовы і разбудовы Эўропы перашкодай стаіць акупацыя, скасаваньне якой зьяўляецца неадкладнай і неадхільнай задачай ураду, чаго трэбуе ад яго згодна ўвесь нямецкі народ. Справа скасаваньня акупацыі—такая ясная ды простая, што не зразумець яе ня можна. — Значыць — трэба толькі добрай волі, каб яе разьвязаць. За гэтай добрай воляй новы нямецкі ўрад рашуча і зьвернецца да акупацыйных дзяржаваў, слушна дамагаючыся адбудовы поўнай нямецкай сувэрэннасьці над нямецкай зямлёй.

Далей канцлер сцьвердзіў, што Нямеччына дала даволі доказаў сваей мірнай волі, шчыра і выдатна супрацуючы ў Лізе Нацыяў з іншымі дзяржавамі над умацаваньнем міру. У аднэй з найважнейшых галінаў гэтай працы—у справе разаружэньня—Нямеччына праявіла навет значна больш добрай волі і шчырасьці, як іншыя дзяржавы. Дык цяпер нямецкі ўрад высоўвае гэтую задачу разбра-

еньня, як першарадную. Нямеччына першая—бяз ніякіх засьцярогаў — прыняла міравы праект Кэллога.

Далей чарговай задачай ураду зьяўляецца перагляд справы адшкадаваньняў. Самі тварцы „пляну Доўса“ лічылі свой праект толькі тымчасовым вырашэньнем справы. 4 гады тасаваньня гэтага пляну ясна паказалі патрэбу яго перагляду.

Далей дэклярацыя кажа аб праграме новага ўраду ў галіне гаспадарчага супрацоўніцтва народаў, якое Нямеччына лічыць асабліва важным для ўкрапленьня сусьветнага міру, кірулючыся пры гэтым пастановамі Жэнэўскай Гаспадарчай Канфэрэнцыі. Урад будзе імкнуцца да — зьніжэньня мытных аплатаў—шляхам міжнародных трактатаў — да пашырэньня гаспадарчых адносінаў, асабліва-ж з дзяржавамі — на Усход ад Нямеччыны (гэта—абяцаньне прысьпешыць трактат з Польшчай). Далей канцлер абяцаў правесьці законы, якія дадуць ураду права глыбокага кантролю над картэлямі ды трэстамі (вялікімі хаўрусамі прамысловага капіталу); абяцаў ратыфікацыю пастановаў Вашынгтонскай Канфэрэнцыі ў справе 8-гадзін. дня працы.

У справе рэйхсвэру (арміі) канцлер абяцаў рашучыя меры, якія забясьпечаць апалітычнасьць ды беспартыйнасьць аружнай сілы нямецкага народу, і—даверые да яе з боку ўсяго народу.

У справе падаткавай канцлер абяцаў больш простыя, адналітыя і справядлівыя падаткі.

Урад уннясе праект рэформы выбарнага закону, які, не касуючы прынцыпу прапарцыянальнасьці, шляхам зьмяншэньня выбарных акругоў, прыблізіць узаемна выбаршчыкаў да паслоў. Урад апрацуе праект рэформы дзяржаўнага ладу і будовы саюзнай рэспублікі—у напрамку большага аб'яднаньня складовых краёў яе.

У канцы канцлер сцьвердзіў, што гэтая дэклярацыя мае паказаць, што новы нямецкі ўрад рашуча, шчыра і паважна бярэцца за вырашэньне найбольш важных спраў, ня ўхіляючыся ад цяжару працы і адказнасьці.

Канцлер-сацыяліст дадаў, што новы ўрад, ня гледзячы на кіруючую ролю у ім сацыялістаў, зразумела-ж, ня можа распачаць чыста сацыялістычныя рэформы, бо ўрад зложаны больш, як напалову, з буржуазных міністраў, з якімі трэба было ўвайсьці ў чарговы кампраміс. Але праца новага ўраду будзе існці ў напрамку сацыяльна-дэмакратычных рэформаў.

Дэклярацыя новага ўраду, які складаецца, як ведама, з „асабіста (не партыйна) адказных“ міністраў, сябраў 4 цэнтра-левых групаў парляманту, спаткана ў палаце гэтай большасьцяй яго, ведама-ж,—прыхільна.

Апазіцыя—злева—камуністы, справа—нацыяналісты ды гітлероўцы—часта перарывалі прамовы канцлера сваімі пратэстамі.

Таксама розна ацэнівае дэклярацыю канцлера Мюллера нямецкая прэса.

Але найбольш цікаўна паглядзець, як адгукнулася на дэклярацыю новага нямецкага ўраду француская прэса. Бо-ж—ад паразуменьня між Францыяй і Нямеччынай у найвялікшай меры залежаць будзе,—ці далейшыя падзеі ў Эўропе пойдуць шляхам умацаваньня міру, ці, наадварот — шляхам шпаркага падрыхтаваньня новай, можа, і блізкай вайны.

Француская прэса, зразумела, асабліва падхапіла ды разважае наступныя заявы і дамаганьні нямецкай дэклярацыі:

1. Заяву аб тым, што Нямеччына безадкладна выступіць з фармальным трэбаваньнем скасаваньня акупацыі Надрэніі і абшару Саары (апошні Францыя лічыць ужо—амаль не „сваім“)!..,—высоўваючы гэтую справу за падставовы варунак нямецка-францускага паразуменьня...

2. Заяву аб тым, што Нямеччына патрэбуе агульнага разбраеньня, ясна прадбачанае ў Вэрсальскім Трактаце, які выразна матывываў разбраеньне Нямеччыны, як першы крок дзеля агульнага разбраеньня!!.

3. Заяву канцлера аб тым, што Нямеччына афіцыяльна патрэбуе перагляду „Пляну Доўса“...

4. Заяву, што Нямеччына будзе — поруч з Амэрыкай — шчыра дамагацца агульнага прыняцьця праекту Кэллога — аб забароне назаўсёды ўсялякай вайны...

5. Заяву аб вернасьці Нямеччыны „Лёкарнскім Трактатам“ і аб выračэньні ўсялякай думкі аб „рэваншу“.

6. Заяву аб рашучай адмове Нямеччыны ад „Усходняга Лёкарно“ (прызнаньня непарушнасьці польскіх граніцаў) і аб тым, што нямецкі ўрад „патрэбуе ад заходніх дзяржаваў рашучага націску на „некаторыя дзяржавы“ (чытай: Польшу), каб яны кінулі думку аб нейкай сувязі між Рэйнскім Трактатам (з акупацыяй Надрэніі) і справай забясьпечаньня ўсходніх (польскіх) граніцаў“...

Француская прэса наагул—„дзякуе нямецкім сацыялістам, што яны так выразна і шчыра паставілі запраўды ж найважнейшыя чарговыя праблемы бягучай эўрапэйскай палітыкі“!.. Прэса розных напрамкаў, ведама-ж, па-рознаму адносіцца да гэтых дамаганьняў новага нямецкага ўраду.

Правая прэса — наагуль заклікае, каб **Францыя ня верыла новаму леваму нямецкага ўраду**, які ў-ва ўсіх нямецкіх справах—нічым ня розьніцца ад любога правага“!—„Пад праграмай загранічнай палітыкі нямецкіх сацыялістаў мог-бы сьмела падпісацца кожны правы нямецкі прэм'ер“!.. „Канцлер Мюллер кажа толькі аб нямецкіх дамаганьнях, але ня кажа нічога аб тых кампэнсацыях (заплатах), якімі ён мае заплаціць саюзьнікам за выкананьне яго трэбаваньняў“. Дык—якія спосабы будуць мець саюзьнікі—для націску на Нямеччыну..., калі назаўтра пасьля скасаваньня акупацыі яе ўрад паставіць на чаргу дня справу перагляду сваіх усходніх граніцаў“... Такі голас недаверыя, пануючага сарод францускай правіцы (глядзі „Кур'ер Варш“. 5/VII).

Наадварот—француская левая прэса, як цьвердзіць карэсп. тэй-жа газэты, — кажа, што—„**габінэт Мюллера, як раз такі, якому ня толькі можна, але і трэба верыць на слова**“... Навет сам чаловы публіцыст ведамы п. Заўэрвэйн (ці Сорвэн) газ. „Матэн“ захопліваецца дэклярацыяй, заклікаючы ўсе дзяржавы—„з увагай і пашанай аднесьціся да голасу новай Нямеччыны“.

Але асабліва засумлены карэспандэнт польскай правай газэты **голасам найвялікшай ды найпаважнейшай — паў-урадавай француская газэты „Тан“, якая таксама вельмі прыхільна ацаніла дэклярацыю Мюллера, дый — „у сваім захопленьні палітыкай Брыяна** (гэта значыць—шчырага паразуменьня з Нямеччынай) — **не заўважыла навет у сваіх перадавіцах, пасьвечаных дэклярацыі, усяго таго, што нямецкі канцлер нагаварыў у справе ўсходніх граніцаў і „Усходняга Лёкарно“!**.

Такім чынам, мы маем права сцьвярдзіць, што найбольш уплывовыя палітычныя колы сучаснай Францыі, — на чале з самім Пуанкарэ, **які шукае ў парляманьце апоры ў цэнтра-левай большасьці, ня кажучы ўжо аб Брыяне і сацыялістах, наагул прыхільна аднесьліся да заяваў новага нямецкага прэм'ера.**

Гэта абяцае хуткія плады рашучага супрацоўніцтва абодвух урадаў.

—·—

Але надзвычайна цікаўна раўналежна пазнаёміцца бліжэй з тымі трывогамі, якія выклікаў падыход да ўлады нямецкіх „пацыфістаў“ **у лягеры францускага мілітарызму, ці „баявога штабу“ францускай правіцы**, якая нядаўна, як ведама, так гучна прымала ды частавала ў Парыжу ген. Сікорскага, які ўасабляе для „яе Францыі“ найбольш пажаданую для яе „францускую Польшчу“...

Вось, як перадае той-жа карэспандэнт голас гэтай, мілай эндэцыі, „Францыі“, устрывожанай да апошняга стварэньнем... пацыфічнага, левага ўраду ў Нямеччыне, які шчыра імкнецца да паразуменьня з Францыяй... — Так казаў яму „выдатны дыплёмат“, вырашаўшы нядаўна лёсы Эўропы (!!)

„У працягу апошніх месяцаў Нямеччына зрабіла надзвычайны высілак прапаганды на ўсім сьвеце. Дзеля таго нямецкія ўплывы ўсьцяж растуць, пранікаючы ўсё глыбей у шырокія масы грамадзянства ўсіх краёў і народаў. Уплывы гэтыя — ня толькі палітычна, але і гаспадарча прыхіляюць да Нямеччыны шырокія колы сусьветнага грамадзянства“...

З асаблівым жахам сцьвярджае „выдатны дыплёмат“ гэты ўзрост прыхільнасьці да Нямеччыны ў-ва Францыі! — „Дык урэшце вайсковыя сфэры Францыі паважна занепакоіліся штодзенна ўзрастаючымі побач з тым **і прэтэнзыямі з боку Бэрліну.** Нямецкія дамаганьні выступаюць цяпер ужо ня толькі зусім яўна, але і нахальна (!) а калі ідзе аб польскія справы, дык—без усялякіх цэрэмоніяў“!..

„На апошнія выбары **ў Нямеччыне трэба глядзець ня інакш, як на лоўную ды спрытную ігру, якая пастаўлена на сцэну—у паразуменьні з нямецкімі нацыяналістамі (!?).** Гэтыя выбары былі штучна падрыхтаваны галоўным чынам (!) — у мэтах правядзеньня скасаваньня акупацыі. Бо-ж сцьверджана, што чацьвертая частка ўсіх стрымаўшыхся ад учасьця ў выбарах прыпадае на нямецкіх нацыяналістаў, якія такім чынам сьведама забясьпечылі перамогу сацыялістаў (!?). Цяпер уся Нямеччына — пераконана, што яе „пацыфістычны ўрад“ бясспрэчна дасьць ёй скасаваньне акупацыі“!—„Але-ж ні для каго з нас — ня тайна, што як толькі саюзьнікі выпусьцяць з рук гэты адзіны астаўшыся ў іх козыр-акупацыю, — дык Бэрлін адразу пачне гутарыць зусім іншым тонам. — А ўжо пэўне-ж,—у адносінах да Польшчы гэты тон аказаўся-б аж залішне выразным. Дзеля таго мін. Залескі меў усе падставы цьвердзіць, што скасаваньне акупацыі датычыць беспасрэдня жыцьця ды бясьпечнасьці Польшчы“.

Да зрэалізаваньня гэтай агульнай небясьпекі—блізкага скасаваньня акупацыі — прычынілася, як цьвердзіць далей „выдатны дыплёмат“, паміж іншым і дрэнная палітыка вялікіх саюзных дзяржаваў адносна да Малай Антанты: ня здолелі яны ўстрымаць кіраўніка апошняй, мін. Бэнэша, ад падарожы да Бэрліну“!..

„Няменш дзіўная ёсьць палітыка Мусоліні, які, здаецца, лёгкаважыць небясьпеку „аншлюсу“ (далучэньня Аўстрыі да Нямеччыны), калі папросту не памагае гэтаму злучэньню“!..

У канцы сваей цікаўнай гутаркі „выдатны дыплёмат“ ускладае вялікія надзеі на тое, што—мейсца хворага Брыяна займе сам Пуанкарэ, які, скончыўшы санацыю фінансаў, займецца „палітычнай санацыяй Францыі“. А тады—скончацца адразу—„правакацыі нямецкага агента Вальдэмараса“ і ўсялякія нямецкія пагрозы Польшчы!..

Вось як на крайнім флянгу францускай мілітарыстычнай правіцы лятуцяць аб „адраджэньні Пуанкарэ 1922—1924 г. г.“, даўно ўжо—„пахаваўшага сам сабе“...

Але сам афіцыёз Пуанкарэ, як бачым, запярэчвае гэтым лятуценьням: паразуменьне паміж Францыяй і Нямеччынай—няўхільна!—А—якой цаной ды чыім коштам, гэта пабачым у хуткім часе.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Рэха экспозэ Марш. Пілсудскага.

Экспозэ Марш. Пілсудскага выклікала ў ППС неспадзявана сільную „рэакцыю“.

„Рэакцыя“ ППС-аў выявілася ў тым, што таго-ж дня, на паседжаньні парляментарнага клюбу партыі, ППС-ы запратэставалі проці таго мейсца ў экспозэ Пілсудскага, дзе гаворыцца аб магчымасьці „октроёваньня“ новых праў у Польшчы і разам вынесьлі пастанову бязумоўнай (bezwzględnej) „абароны“ ППС-амі дэмакратыі і народнага прадстаўніцтва. (А выдаваньне суду беларускіх паслоў?).

Трэба тут адзначыць, што калі ў два тыдні па „выпадках маёвых“, Марш. Пілсудскі, будучы тады такжа ваенным міністрам, сказаў сваю прамову ў прысутнасьці паслоў і сэнатараў, у сувязі з сваей кандыдатурай на Прэзыдэнта Рэспублікі, проці „раскялзанага“ соймаўладзтва, зрабіўшую ня меншае ўражаньне, як і апошняе экспозэ, дык прысутныя тады пэпээсаўскія паслы гэтым нічуць не абразіліся, а на заўтрае дык навет наладзілі вялікія маніфэстацыі, у якіх дамагаліся выбару Прэзыдэнтам Пілсудскага. Але на гэтым яшчэ не канец, бо калі Пілсудскі зрокся прэзыдэнтуры, дык ППС-ы „горача“ пратэставалі проці гэтага. А цяпер пратэстуюць зусім наадварот і, як заўсёды, гэты іх „жэст гарачага пратэсту“ зусім скора астыне, як і кожны „жэст“ двулікага паганскага бога Януса, уваскросшага цяпер у Польшчы ў постаці ППС-аў.

„Стронніцтва Хлопске“ (іншыя згодніцкія партыі, яшчэ не задэманстравалі афіцыяльна свае двутварасьці) пайшло, разумеецца—„сьледам за дзедам“: і „Стр. Хлопске“ прыняло пастанову (4. VII. 28 г.), у якой заклікае ўсіх польскіх сялян да абароны рэспубліканскага і парляманцкага ладу.

Маршалак Сойму Дашынскі, кажучы, што адным з „выхадаў“, з сучаснага „бязвыходнага“ становішча ўлады ў Польшчы ёсьць... паразуменьне адзінкі з лявіцай, што дасьць бяз мала абсалютную ўрадавую большасьць.

Вось дык слаўная „лявіца“?!

Маршалак Дашынскі аб Сойме і яго мінулай сэсіі.

Апошнімі днямі Маршалак Сойму Дашынскі даў прэсе экспозэ (гутарку), якое можна назваць адказам на экспозэ Марш. Пілсудскага. Марш. Дашынскі лічыць, што цяперашні Сойм працаваў вельмі пільна і многа шыбчэй, чым папярэднія—(зацьверджаньне бюджэту за 2 з паловай месяцы заместа, як па Канстытуцыі, 3 з паловай, і многа ўставаў і праектаў). Далей Марш. Дашынскі сцьвярджае, што ў Сойме няма большасьці, а з гэтага, няма і выходу, бо соймавыя групы прадстаўляюцца наступна: 1) ўрадавая—130 паслоў; 2) лявіца—131 паслоў; 3) правіца і цэнтр—90 паслоў; 4) меншасьці—80 паслоў.

ДЗІКІ ПАСОЛ.

(Фэльетон).

— Якія нялюдзкоты на сьвеце дзеюцца! Чула ты гэту навіну Агатка?—убегшы затараторыла Аўдоля.

— Не, нічога ня чула, а што-ж такое?—

— Вось табе на! Аб гэтым-жа ўсё сяло ўжо ведае!—

— Усё сяло? Нічога дзіўнага! сяджу праз цэлюсенькі дзень за кроснамі, дык скуль тут што даведаешся? Дый ты прысядзь, Аўдоленька, і раскажы мне хутчэй! — туравіла Агата суседку і забылася навет пра блін, які ўжо пачаў смаліцца ў печы.

— Мая ты родненькая, проста страхата!—Пасол-жа ў Сойме адзін ашалеў!—

— Ашалеў? Ну дык што-ж? Хай яны сабе тям і ўсё галовы скруцяць, усё роўна нам з іх ніякай карысьці нямашака! —

— Гэта-ж была-б не бяда, сястрыца, каб ён ня тутэйшы, але ж у тым і справа, што наш—беларускі!—

— Ну дык што-ж, калі беларускі?—

— Як што? Ен-жа пачне тут швэндацца, на людзёў кідацца — нос можа катораму адгрызьці, або вочы выдраць!—

— Як-жа-ж гэта так? Да гэтага-ж ніколі не дапусьцяць—яго-ж зараз зьвяжуць і ў бальніцу.—

— Зьвяжы-ж, калі ён пасол!...—

— Пачакай, сястрыца! — спахваціліся гаспадыня —я і забылась, што блін у печы! Э-э!—зьдзівілася яна, выцягнуўшы патэльню—на вугалёк сьпятрыўся! А патэльня аж чырвоная зрабілася; ня будуць цяпер бліны адставаць! Ну, кадук іх, можа хопіць!—Бразнула патэльню пад прыпечак і падсела да суседкі.—

— Расказвай, Аўдолечка, далей! —

— Ага, дык вось у чым справа! Ён, пасол, а да пасла ніхто ня мае права навет пальцам дакрануцца! Такі ўжо закон у іх! А ты кажаш—зьвяжуць!—

— А хто іх там ведае! А можа гэта яшчэ і ня праўда, выдумка толькі людзкая!—

— Як жа няпраўда! Сама чула, як Владук учора чытаў! Дзікі, пішуць, спадаром называецца, ходзіць адзін па Сойме гэтым! Таварыш, які яго дасюль дагледаў, і той ужо адрокся—спаківаў яго. Немагчыма! Баіцца чалавек за сваё жыцьце! Шалёны ж і свайго роднага не пазнае!—

— А як-жа іншыя—там жа ж іх многа! Паразьляталіся! Хто на цягнік, хто на матабіль,—хто як мог, ды ходу!—

— Яны паўцякалі, а што нам рабіць, калі-б ён да нас прывалокся?—

— Што-ж ты будзеш рабіць? Адзін толькі ратунак—замыкай дзьверы, засланяй вокны ды пільнуй, каб раптам не засьпеў! Я свайму Януку прыказала, каб нікуды ад хаты ня аддаляўся!—

— А мой-жа, сястрыца, паехаў у поле Барані божа, напаткае?!—

— Чытае, васпанейка, няшчасьце! Каб ён быў чалавек просты — раду скора далі-б! З'ехаў бы які мужчына па галаве і досыць яму было б, а то-ж—пасол! Яго толькі зачапі—зараз паліцыя арыштуе і сядзі, чалавек, год або два!—

— Дзякуй, сястрыца, што ты мне гэта сказала! З паўдня і я свайго ня пушчу на поле.—

— А то як-жа-ж—трэба, каб усе ведалі, хай кожны прыгатуецца. А, трэба хучэй існці да хаты, мой напэўна лаецца — сьнедаць даўно захацеў! — Выйшла Аўдоля на вуліцу і думае:

— Ці не зайсьціся яшчэ да Макаровых?—яны пэўне аб гэтым ня ведаюць!—ды глядзь у той бок на вёску:

— Людцы!? — закрычэла яна на ўсю моц—Шалёны ідзе!!... Дзікі!!... Ратуйцеся!!...

і як куля, уляцела ў сені, лясь засаўкай—ды, ў хату.

— Якой ты немачы бадзяешся! — спаткаў яе мужык—скора паўдзэнь, а я яшчэ ня сьнедаўшы!... Чаго вылупіла вочы, быццам косткай задушыўшыся?—

— Ай... гэны... пасол... шалёны ідзе!! Зачыняй вокны, дурань, а ня сьнедаць! З самога, глядзі, каб гэны сьняданьня пя зрабіў!—

— Пасол? А скуль ты ведаеш, што ён...—

— Д... дурны, сама яго бачыла! У пальце, грудзі белыя, шатаецца ў бакі! .. Чаго-ж ты, чучаранак, стаіш?! Зачыняй вокны, табе кажу!—

— А што ты асьлепла—ня відзіш, што вокны зачынены?—

— Эх, варона ты дурная! Думаеш, праз школо ня ўломіцца ў хату? Засланяй сталом, дошкамі якімі! Скарэй!! — скрабануў Янук патыліцу і ўзяўся памагаць жонцы.

У момант адно вакно заклалі пакрыўкай ад стала, другое — заслонкай; падперлі качэргамі, пад дзьверы, ад вуліцы, прывалаклі скрыню.

— Фу!—запала Аўдоля—ажна лоб стаў мокры! Куды-ж ты гэта палез, салапяка! Сам на печ, а жонка хай прападае?! —

— Дык жа-ж вокны замураваны!...—

— Замураваны! А ён ня можа ўламіцца?—шалёныя-ж—дужыя! Ідзі сюды і дзяржы плячом! — камандавала Аўдоля, а сама, праз цікавасьць глядзь у шчылінку!

— Ай, божухны!—ўскрыкнула яна, убачыўшы, што суседка Мар'я спакойна корміць парасят на сваім падворку.—Пэўна яна,—думае Аўдоля—бедная, нічога ня ведае! Трэба яе ратаваць — выскачу хуценька праз дзянік!—Ты-ж дзяржы, не адпушчай, злыдзень!—закамандавала на адход дзеду.

— Дзяржу, дзяржу!—азваўся той і ня бачыў, як выйшла жонка, бо стаяў тварам да сцяны.

— Што ты, Мар'я, здурэла ці што?! — закрычэла праз вуліцу Аўдоля.—Шалёны-ж гэны ідзе!! Хавайся!!...

— Гдзе?! — запытала тая і з перапуду выпусьціла з рук міску.

— Ды вунь—ужо ля Міхалкавых!...

— Ай, божухны, паляцеў да іх на падворак!! Зачыняйся скарэй!!—крыкнула і сама, круць, у зад! Даляцела да дзьвярэй, цапшт,—замкнёна!

— Адчыні! — закрычэла нейкім дзікім голасам, а як Янук не адазваўся, то штось стукнула, як мяхом, па дзьвярох.

— Адчыні!!—ажна пішчэла ўжо баба.

— Цягніся сваёй дарогай! Нечага тут!—пачулася з хаты.

— Ды што ты, ашалеў ці што?!—Пусьці!!—ірвала Аўдоля за клямку.

— Ты сам ашалеў! Ідзі, панок, адсюль прэч падабру, паздарову!—строга адазваўся Янка.

— Дзядок, гэта-ж я—твая Аўдоля!—

— Хоць ты сто разоў называйся Аўдоляй—ня адчыню!—

— Ды, што ты, Яначка, мяне не пазнаеш?!—

— Ня абдурыш, думаеш, што мужык дык зусім дурны? Нечага тут прыкідвацца рознымі бабамі! Ідзі адсюль, пакуль не заславаўся! Не пагляджу, што ты нятыкальны, як ткну вось таўкачом — на месцы кінеш!—гразіўся гаспадар.

— Адчыняй, каб ты праваліўся!! Што ты там глуздзіш?!

— Аўдоля і туды і сюды—ня адмыкае!

— Матка найсьвяцейшая, куды тут дзецца?! Паляту да Мар'і—падумала.

— Скок з браму на вуліцу, ды так і абамлела бабка—чуць ня далася ў гэнага з белымі грудзямі! Памуцілася ў вачох, бед-

З гэтага бязвыхаднага становішча Маршалак бачыць 3 выхады: 1) роспуск Сойму, 2) блёк „адзінкі“ з лявіцай, 3) „zamach stanu“ (пераварот). Далей Маршалак зьвяртае ўвагу на пэўныя спэцыфічныя рысы ў польскім парлямантарызьме. Напр., Сойм ня выразіў недаверыя, але скасаваў „дыспазіцыйныя фундушы“ міністра, а міністр не „wyciąga“ з гэтага „консэквэнцыяў“.

Пераходзячы да ўрадавых праектаў, Дашынскі находзіць, што Сойм павінен быў прыняць урадавы праект аб павялічэньні грунтовых і будынкавых (ад „коміна“) падаткаў у вёсках. (Вельмі характарна для прадстаўніка ППС-аў!).

Гаворачы аб мінулай сэсіі, Дашынскі падчырківае, што яна прайшла зусім спакойна—бяз ніякіх „нашых“ выступленьняў і навет без выключэньняў з паседжаньня і бяз крыкаў і шумаў (за выняткам 1 разу). „Калі-б у гэтым Сойме стварылася большасьць“, канчае Дашынскі, „дык парлямантарызм у Польшчы мог-бы памысна разьвіцца, як магутны дзейнік публічнага жыцьця. Гвалтоўныя-ж замахі на Канстытуцыю і парлямантарызм могуць давясьці Дзяржаву да цяжкіх зьменаў (przesileń).

Як бачым, дык, насколькі Пілсудскі „валіць“ на Канстытуцыю і на Сойм, на непрадуктыўнасьць яго працы і навет на непатрэбнасьць яго, настолькі Дашынскі „бароніць“ (ня заікаючыся навет аб урадзе) Сойм і Канстытуцыю.

Мусім адзначыць, што гэтая абарона ня ёсьць гутарка „роўнага з роўным“, але мальба—скарга „папхнутага“ (kopniętego) і прыціснутага ботам „пераможцы“ чалавека, які дадае да сваіх слоў: „хай будзе не мая, але твая воля“.

„Добрыя ўражаньні“.

Гэтымі днямі выехала з Польшчы дэлегацыя латвійскіх сацыялістаў, якая перад адходам цягніка запяяла на варшаўскім вакзале работніцкую песьню.

Прысутны на вакзале „przodownik“ Касоўскі (як падае „Polska Wolność“ № 29) „zakazał“ пяяць, кажучы: „Тут не Расея, трэба на гэта мець дазваленьне Камісара Ураду“. Трэба адзначыць, што латышы перасталі пяяць, а праводзіўшыя іх пэпэсы былі вельмі „zmartwieni“. Бо-ж яны так стараліся паказаць латышам усе доказы адраджэньня і культуры Польшчы! Аж тут паліцыянт папсуў усю „музыку“ польскіх сацыялістаў.

Заграніцай.

„Новы курс“ у Маскве.

Газэты пішуць, быццам у Маскве ізноў адзначаецца „паварот направа“,—ці палітычна—больш у бок лагоднасьці ўлады, а сацыяльна — на карысьць сялянства. На чале гэтага „права-сялянскага напрамку“ стаяць, як ведама, Калінін, Рыкаў, Чычэрын і іншыя. Сталін, вядучы барацьбу з апазіцыяй, якая падтрымлівала якраз гэты больш „лева-пралетарскі курс“, у працягу значнага часу трымаўся якраз гэтага апошняга курсу, каб канчальна выбіць усялякі грунт з-пад ног апазіцыі. Але цяпер, пасьля канчальнага зьліквідаваньня апазіцыі, пачаў рашуча „выпрамляць курс“... Дык у зьвязку з гэтым — усе распараджэньні, скіраваныя ў апошнія часы проці сялянства (ў зьвязку з хлебнай кампаніяй), скасаваны. У зьвязку з тым-жа паваротам курсу, затрыманы ад'езд Чычэрына заграніцу на курацыю.

Зборы ў СССР на карысьць вызваленчага руху ў Кітаі.

З Масквы даносяць, што радавы ўрад назначыў на 8-га ліпня на ўсім прасторы СССР зборы грошаў на карысьць вызваленчага руху ў Кітаі.

Ваяўнічыя прамовы павадыроў чырвонай арміі.

На ўрачыстасьці ўручэньня дыплёмаў скончыўшым Акадэмію Генеральнага Штабу ў Маскве, якая адбылася 2-га ліпня, сказалі прамовы „прэзыдэнт“ ці „староста“ С.С.Р.Р. Калінін, заступнік камісара ваенных справаў Уншліхт і начальнік Генеральнага Штабу Шапашнікаў. Усе аратары прадбачылі, што новыя чырвоныя штабавікі ў хуткім часе могуць быць паклікаваны, каб паказалі здабытую ў Акадэміі ваенную веду—на полі бітвы.

Проці-польскія мітынгі на Украіне.

„Рабочая Масква“ даносіць аб работніцкіх мітынгах, якія адбыліся ў-ва ўсіх раёнах Харкава—„проці авантураў палітыкі Пілсудскага дый спробаў паасобных палітычных авантурыстаў, у родзе Лявіцкага, выступаць ад імя Украіны“. Усе аратары-работнікі аднадушна заяўлялі, што будаваць „сацыялістычную Украіну можна толькі ў цесным саюзе з усімі сацыялістычнымі рэспублікамі Радавага Саюзу, дый што ўсялякай спробе перашкаджаць гэтаму супольнаму будаўніцтву будзе дадзены рашучы адпор“.

„Сегодня“ 5./VII.

Нямецкія камуністы бароняць польскіх парабкаў ад вызыску нямецкіх абшарн.

„Кур. Варш.“ паведамляе з Бэрліну, што камуністычная фракцыя Прускага Сойму ўнясла інтэрпэляцыю ў справе нялюдзкага трактаваньня польскіх сельска-гаспадарчых работнікаў, прыехаўшых на летнія работы, прускімі абшарнікамі. Камуністычная інтэрпэляцыя прыводзіць цэлы рад фактаў, з якіх відаць, што польскіх работнікаў папросту катуюць абшарніцкія эканомы, б'юць іх віламі і лапатамі — за самую благую віну; быў выпадак, што польскаму парабку абшарнік грагіў сьмерцяй з рэвальвэру. Як ведама, нямецкія аграрыі заўсёды дамагаюцца ад ураду палёгак для сэзановай эміграцыі работнікаў з Польшчы ў Нямеччыну, каб мець парабка, значна танейшага ды пакарлейшага, чым нямецкі.

Прыдаліся, відаць, і польскай эндэцкай газэце камуністы. Але, відаць, толькі тады, калі яны бароняць у Нямеччыне польскага работніка ды парабка ад нямецкага абшарніка. Але, калі тыя-ж камуністы бароняць, напрыклад, беларускага або польскага сельскага работніка ад „жэкомых“ гвалтаў з боку польскага абшарніка ў Польшчы, дык гэта-ж пэўне „антыпаньствовая, дэструкцыйная праца“.

Трыумфы Горкага ў СССР.

Урад СССР ахвяраваў для жыцьця ведамаму пісьменьніку Горкаму багаты палац б. князя Варанцова ў Крыме. Дык Горкі ня мае ўжо больш ехаць на жыцьцё ў Італію, дзе ён мае сваю віллу. Здароўе Горкага паправілася. Перад ад'ездам у Крым Горкі мае паехаць з Масквы ў Ленінград, дзе яму ладзіцца ўрачыстае спатканьне ў Акадэміі Навук.

Новая проці-польская прамова Вальдэмараса.

На адбыўшымся 1 ліпня ў Коўні зьезьдзе ўрадавай партыі таўтінінкаў“ (нацыяналістаў) Вальдэмарас сказаў прамову, у якой, прадставіўшы гістарычны ход польска-літоўскага спору, заявіў, што Польшча і цяпер, як даўней, рыхтуецца ўсьцяж да захвату Літвы. Дзеля таго Літва ня можа зрабіць Польшчы ніякіх уступак у справе Вільні.

Сын Чанг-Тсо-Ліна—на месцы бацькі.

З Мукдэну даносяць, што сын маршала Чанг-Тсо-Ліна, генарал Чанг-Тсі-Ліянг, мае фармальна абвясьціць сябе дыктатарам Манчжурыі. Быццам, усе правінцыяльныя ўлады Манчжурыі зьвярнуліся да яго, каб ён прыняў усе тыя тытулы ды становішчы, якія меў яго бацька. Японскі ўрад быццам — выразіў сваю згоду на гэта.

Ен—прыхільнік Куомінтангу!

Сын Чанг-Тсо-Ліна, стаўшы па бацьку дыктатарам Манчжурыі, заявіў тэлеграмай да галоўнага камандзіра паўдзённых арміяў Чанг-Кай-Шэка, што ён мае прыняць рашучае ўчасьце ў працы над нацыянальным аб'яднаньнем Кітаю, а дзеля таго ў найбліжэйшым часе вышле сваіх паўнамоцнікаў да Пэкіну на нараду ў справе гэтага аб'яднаньня. Прэса цьвердзіць, што сын Чанг-Тсо-Ліна яшчэ за жыцьця свайго бацькі заяўляў сябе прыхільнікам партыі Куомінтангу, ці—кітайскіх нацыяналістаў-незалежнікаў.

Толькі вось — ці здолее ён цалком вызваліцца з-пад японскага браніраванага кулака, якому так „шчыра“ служыў яго бацька, даўшы цяпер Японіі страшэннае засільле ў краі.

Тэлеграма з Мукдэну 3/VII якраз кажа, што — як толькі гэты новы дыктатар Манчжурыі абвясьціў сябе прыемнікам Чанг-Тсо-Ліна, як зараз-жа японскі ўрад падсунуў яму для подпісу ўмову, пацьвярджаючую ўсе заключаныя яго бацькай трактаты — у справе манчжурскай чыгункі і іншых лічных японскіх канцэсіяў у Манчжурыі!.. І той, ведама, падпісаў!

Чарговы замах у Баўгарыі.

8-га ліпня на вуліцы Софіі (сталіцы Баўгарыі) стрэламі з рэвальвэру забіты ген. Пратагораў. Таварыш, з якім ішоў забіты, цяжка ранены. Падробнасьцяў пакуль няма. Але чарговы замах раскрывае, што—пад вонкавым „спакоем“ у краі тлее ўсьцяж народнае нездаволеньне.

У справе забойства ген. Пратагорава.

Забіты ген. Пратагораў быў адным з павадыроў ведамай Македонскай Рэвалюцыйнай арганізацыі, але чамусьці страціў даверые яе цэнтральных уладаў, якая патрэбавала, каб ён адыйшоў цалком ад усялякай палітычнай працы.

Але ген. Пратагораў, сьпярша абяцаўшы споўніць гэты загад, пасьля, апіраючыся на пэўную групу сваіх прыхільнікаў, адмовіўся. Плянаваны агульны кангрэс Македонскай арганізацыі ўсьцяж адкладваўся, дык стварыўшыся раскол у партыі ўсьцяж завастраўся. Тады, як цьвердзіць быццам афіцыяльны орган македонскіх эмігрантаў „Македонія“, старшыня рэвалюцыйнага камітэту Міхайлаў даў загад „убраць Пратагорава, як уносячага раскол у арганізацыю, уся сіла якой—у адзінстве і дысцыпліне яе сябраў!..

Новы габінэт у Югаславіі.

Кароль даручыў ўрэшце місію стварэньня ўраду — ген. Гадзічу, ваеннаму міністру сучаснага ўраду. Габінэт мае быць „не палітычны“, „чыста фаховы“, ці—„габінэт асобаў, а ня партыяў“. У склад ураду маюць увайсьці папалове сэрбы і харваты. Такім чынам роўнасьць харвацкага народу з сэрбскім, з-за чаго йшла ўся барацьба харвацкай апазіцыі з сэрбскімі „эндэкамі“ („радыкаламі“), ужо быццам ажыцьцявілася... прынамсь у межах габінэту ген. Гадзіча... Як аднясецца харвацкая апазіцыя да гэтай спробы, ці ўвойдзе ў склад новага ўраду Радзіч з таварышамі, аб гэтым вестак пакуль-што няма.

най—ірвэцць узад—ды замест у дзьверы, бух, галавой у вушак!

— А...а-э!—здушаным ад страху голасам прасіпела Аўдоля, ногі падкасіліся і яна, як падстрэленая, асунулася на зямлю.

— Цо ты баба... звар...ёва а ла? — Хамска... твоя...—

Глядзь Аўдоля — вучыцель! Адлягло ёй трохі ад сэрца, прыпаднялася і сама сваім вачом ня верыла.

— Дз-дз-дзень... д... добры пан...ночку!—трасучыся яшчэ ад страху, ледзь прагаварыла яна. Вучыцель нічога не паспеў адказаць, бо-ж яго ў гэты момант штось „моцна хістанула ў другі бок—да рову. Аўдоля думала, што ён так і рынецца ў роў, ажна бачыць-ж! Вырыхтваўся і пайшоў, баранучы, далей.

— Тфу! каб ты скіс, сколькі страху нарабіў!—плюнуца яму ў сьлед кабеціна!—

— Адчыні!—стукалася яна ў хату.

— Гэта ты Аўдоля?—

— А няў-жо-ж ты думаў хто! — Штось грукнула аб падлогу, ляснула засаўка і Янук адчыніў дзьверы.

Увайшоўшы, Аўдоля зараз і населася на свайго.

— Ты чаму гэта, каб цябе трасьца, ня пушчаў мяне ў хату-э?! —

— Я думаў, што гэта той... — вінавата адказаў Янук.

— Які табе той? Гэта вучыцель Падгорскі п'яны пайшоў — мусіць у засьценку гулялі!—

— А ты-ж казала...—

— Што я табе казала! Зьбірай, вось, таўкачы! Бач іх нанёс — мяне строіўся біць, каб ты выхвараў!—Паскрабаў патыліцу Янук і прыняўся парадкаваць у хаце, а Аўдоля абвязвала себе галаву, бо ж набіла вялізны гуз на патыліцы.

П. Асана.

Працэс Белар. Сялян.-Работн. Грамады.

Апошняе слова абв. П. Мятлы на судзе 16./V. 1928 г.

У жыцьці сваім, панове судзьдзі, на судзе, як абвінавачаны, выступаю першы раз. Ня ведаю, наагул, што гаворыцца ў апошнім слове. У часе суду даведаўся, што мы—абвінавачаныя можам гаварыць няпраўду. Як у судзьдзі сьледчага, так і тут на судзе, я трымаўся іншага правіла: гаварыць праўду. Магчыма, што сягоньня мне ня будзе веры, але заўтра, праз год, а можа навет праз дзесяць гадоў, праўда мая выясьніцца і тыя, якія сягоньня не паверацъ, тады падцьвердзяць гэтую праўду.

Пан сэнатар Абрамовіч—мой абаронца—выясьніў вартасьць паказаньняў сьведкаў. Пан пракурор прызнаўся, што 16 з іх ужо „абалена“. Застаецца „абаліць“ рэшту. Але ці трэба „абаліваць“ тое, што ня мае значэньня, або ляпей тых, якія самі сябе „абалілі“. Ня можна, напрыклад, паважна трактаваць такіх сьведкаў, як Кавалёнак, Якімовіч, Рагоўскі і інш., якія на судзе падчыркнулі, што нічога проціў мяне не гаварылі, або калі гаварылі, то такую недарэчнасьць, як сьведка Пашкевіч з Маладэчна, — якая сама сабой адпадае. На „абаленьне“ ўсіх сьведкаў выставіў я з свайго боку 37 сьведкаў, але на жаль суд прызнаў патрэбным выклікаць толькі пяцёх, а на свой кошт я ня мог іх прывазіць, бо пракуратура заарыштавала мае ашчаднасьці.

Да сказанага панам мэцэнасам Абрамовічам мне мала чаго застаецца дадаць. Падчыркну толькі некаторыя мамэнты з мае працы. Але перш, чым перайсьці да гэтага, мушу сказаць аб сваёй мінуўшчыне. Пан пракурор успамінаў Кухцінцы. Гэта мая вёска, дзе я радзіўся і гадаваўся. Акт абвінавачаньня называе мяне русафікатарам. На якой падставе? Ці не таму, што я тры гады быў да вайны вучыцелем. Але ці ня былі на службе ў рускіх і палякі. Ці ад гэтага і яны страцілі свае народнае аблічча, сталі русафікатарамі. На вайне быў 4 гады ў 320 пал. падв. лазарэце. Пры Керэнскім адкамандзіраваны быў у Алексееўскую Ваенную Школу ў Маскве. У часе кастрычнікавай Рэвалюцыі—як юнкер—выступаў проціў Крэмля. Калі ўспомню „Манеж“, Тройцкія і Баравіцкія вароты, Арсенал, то будзе ясна, што я лепей ведаю Маскву, чым пракурорскі сьведка Бабіч. А праўдзівасьць маіх слоў можа падцьверд. п. пракурор Калапскі, які казаў, што ў часе кастрычнікавай рэвалюцыі — як ахвіцэр, так сама быў у Маскве. Далей—Лефортаўскі вастрог, Бутыркі. Па звальненьні прыехаў дамоў. Пры немцах працаваў, як вучыцель, у школе, а пры польскай уладзе заняўся каапэрацыяй. Залажыў каапэратыў у Кухцінцах, а пазьней назначаны быў кіраўніком філіі Віленскага Саюзу Каап. ў Маладэчне. Адгэтуль выехаў ў Сойм, як пасол, выбраны па Сьвянцянскай акрузе.

Агульны нарыс нашае працы ў Сойме даў калега Тарашкевіч. Мне застаецца падчыркнуць некаторыя моманты арганізацыйнай працы, якая беспасярэдня тычылася мяне, ды адкінуць некалькі няслушных закідаў. Вярнуся да свае вёскі..

Пан пракурор сказаў, што кожны мае свае Кухцінцы, свае Максімаўкі. Ад Кухцінцаў, як і ад „Грамады“, я не адракаюся. Былі і ёсьць Кухцінцы, але ня было толькі там тых сабраньняў 10 і 14./І 1927 г., аб якіх упамінаець акт справы. Зрэштай — гэта выясьнілі сьведкі. Аб гэтым ня буду гаварыць. Хацеў-бы толькі, каб панове судзьдзі зьвярнулі ўвагу на дату, калі распачаў сваю „працу“ ў адносінах да мяне пан кам. П. Н. Майхровіч і што вёска Кухцінцы знаходзіцца не ў яго „абрэмбе“, а Мікалаеўскай камэндантуры. Чаму-ж ён ў чатыры дні па маім арышце стаў даведывацца аб маей нібы антыдзяржаўнай працы?—ды зусім проста, панове судзьдзі. Пан кам. Майхровіч меў іншае сумленьне, чым каман. паст. У Мікалаеве, меў такое сумленьне, якое пазволіла яму змусіць свайго чалавека Скаліцкага ўпісаць у пратаколах „wyrznięcie panów“ і інш. рэчы, якія тут на судзе былі спраставаны.

Панове судзьдзі, трудна было прычапіць да мяне ярлык камуніста, дык што-ж робяць? Называюць мяне якімсь камісарам паўстаньня. Якая падстава да гэтага, Паказаньні Глушына! Таго Глушына, які камандзіраваны быў каміс. Кубарскім, Браслаўскага пав., тварыць гурткі, які пісаў у пратаколах правакацыйныя пастановы, які ўжо ў вастрозе ў часе працэсу „Грамады“, стараўся справакаваць „Грамаду“ да галадоўкі. Але што-ж ён казаў. Бачыў мяне першы раз і зараз-жа я „вялеў“ яму зьбіраць аружжа! Панове судзьдзі! Хацеў-бы, каб для мяне пакінулі хоць крышку розуму, бо хіба трэба быць зусім дурным, каб гаварыць, пры першым спатканьні гэткія рэчы незнаёмаму чалавеку, калі-б навет дапусьціць, што такая гутарка была. Але-ж яе ня было і не магло быць. Тое, што ён паказаў пакой у сэкрэтарыяце, дзе быццам гаварыў са мной і што ў той дзень прыяжджаў Ангельскі пасол нічога не даказвае, бо першы лепшы вывядоўца з Вільні ведаў аб гэтым і ня дзіва, што аб гэтым мог быць павядомлены і Глушын. А ўрэшце, магчыма, што і сам ён быў, бо дзьверы сэкрэтарыяту ня былі ні перад кім зачынены, але яшчэ раз кажу, што такой гутаркі ні з ім, ні з кім-небудзь іншым ня меў.

Успаміналі тут нейкага хлапца Якімчыка, які таксама нешта плёў аб аружжы. У Бурсэвіча я ніколі не абедаў, аб чым сьцвердзіў і Бурсэвіч і гэтага хлапца ня ведаю. Хацелі бачыць яго тутака ў судзе, але бацька яго—вывядоўца — як напэўна памятаюць панове судзьдзі—забараніў яму прыехаць на суд; дзеля гэтага і не ўдалося выясьніць праўду.

Нарэшце трэцьцім зьяўляецца Ласёнак Янка з Друі. Аб ім крышку магу застанавіцца, бо дзякуючы мне стаў ён тут на судзе. Здаецца, пан пракурор дужа быў задаволены, пачуўшы правакатарскія „ізліянія“ Ласёнка. Але не сумаваў і я, бо нарэшце даведаўся адкуль чэрпаў свае інфармацыі камісар Кубарскі і камісар Скальскі. Як высьнілася, Ласёнак працуе ў паліцыі ўжо даўно, бо аж з 1925 г. Лезець у „Грамаду“ і арганізуе некалькі гурткоў. У в. Аляксандраве, Леанпольскай вол., на яго прапазыку выбіраюць Зарэку. Тэлегр. мяне вызывае перад маім арыштам у Друю на сабраньне, якое фактычна не адбылося дзеля таго, што той-жа Ласёнак вызначыў зімой пад сабраньне сваю незакончаную хату бяз вокан, дзьвярэй і сталяваньня. Праз цэлы час майго пабыту ў Друі, як цень, цягаўся за мной. Гэта і паслужыла прычынай вызаву яго за сьведку, бо іншых людзей, з якімі спатыкаўся там, я не памятаў прозьвішча. Гэты-ж Ласёнак парадзіў мне зьезьдзіць у госьці да Зарэкі, а не да селяніна з Перабродзкай гміны, які таксама запрашаў у госьці. На жаль не памятаю прозьвішча гэтага селяніна. Правакатар Ласёнак думаў адным замахам тут перад судом „залатвіць“ і свае асабістыя рахункі. Тыя „вэзваньні“ каморніка аб заплаце даўгоў па вэксалёх, якія ён выкінуў на стол перад судом, ясна аб гэтым сьведчыць. Апрача даўга банку, ён назваў яшчэ вэксаль на 350 зл. Гэтыя грошы ён вінен беларускай кнігарні за календары, а ня мне і не за камуністычную літэратуру. Усё яго паказаньне бясстыдная ілжа. Ня буду далей гаварыць аб ім, ня буду затрымліваць увагі Суда на гэткіх людзях, бо яны ня варты гэтага.

З Дзісьненскім паветам, панове судзьдзі, я зьвязаны як тым, што там радзіўся і гадаваўся, так і тым, што найболей там працаваў. Калі закідалі нам, што мы выключна заніmаліся палітычнай працай і гэтым як быццам пашыралі камунізм, то, здаецца, пра Дзісьненскі павет гэтага нельга было-б сказаць. Усе сілы былі скіраваны ў той бок, каб заняцца прадукцыйнай працай, выкарыстаць усе магчымасьці, каб падняць дабрабыт краю і падняць яго культуральна-асьветовы ровень. З гэтай мэтай быў адчынены аддзел Белар. Банка, залажылі каап. „Сноп“ і Т-ва Бел. Школы. І які-ж вынік? Усё назвалі камуністычнай працай. Які-ж выхад? Якім-жа спосабам выйсьці з гэтага кола? І я ня маю адказу, бо ўсё, што носіць назоў беларускі, зараз-жа называюць камуністычным. І на якой падставе такія закіды? Кажуць Скурка камуністы, але-ж гэта няпраўда!

Я пэвен, што суд выявіць гэта і яго звольняць. Гэта добра ведае і пан Скальскі. Хадзіла яму ні аба мяне, ні аб Скурку, а аб тым, каб зьнішчыць Беларускія Установы. Дзеля гэтага адбыліся масавыя арышты ў жніўні 1927 г., а, калі гэта не памагло, арыштавалі яшчэ ў лютым 1928 г. каля 40 чалавек і гэты раз дапялі свайго, бо каапэратыў „Сноп“ перайшоў у рукі дэфраўданта, а Т-ва Бел. Школы асталася бяз управы. І ня дзеля таго гэта сталася, што ўсіх арыштавалі. Не. Хіба і Скальскі ня мог залічыць да камуністых Зяваліча, Уладзімера Дразда і інш., якія прымалі ўдзел у тэй ці іншай працы. Але пагрозамі змусіў іх адыйсьці ад яе. Цяпер, я ведаю, калі працы, каап. напрыклад, перайшла ў рукі паляка, а рэшта установаў спаралізаваны, то і арышты ў Глыбокім на пэўны час спыняцца.

А як адносіліся, панове судзьдзі, да

нашай культурна-асьветнай працы. Думалі адчыніць беларускую школу ў Глыбокім. Кандыдат на пасаду ў гэтую школу Пётра Гайка, прызнаны нягодным, бо ня меў як быццам патрэбных кваліфікацыяў, хоць да вайны і быў інспэктарам гарадзкога вучылішча, але, калі ён згадзіўся вучыць у польскай школе, то восеньню ў тым самым годзе быў назначаны вучыцелем у Глыбоцкую школу, хоць кваліфікацыі былі тыя самыя. Дом грам. Дразда камісія прызнала нягодным пад беларускую школу, але на другі год той самы дом заарэндавалі пад польскую школу, дзе яна знаходзіцца і па сягоняшні дзень. Вось маленькі прыклад адносін да нас. А ці-ж гэта ўсё. Мне цяжка ўспамінаць і пералічаць усе тыя бесканечныя крыўды, якія робіць нам адміністрацыя.

Нас абвінавачваюць і ў агітацыі процiў камасацыі, як дзіўна гэта выглядае, асабліва ў адносінах да мяне. Бацька мой адзін з першых падаў заяву аб камасацыі вёскі Кухцінцы. Некалькі разоў я быў у гэтай справе, як таксама ў справах іншых в. Залесься, Навінцы, Басянкі і інш. у Камісара Зэмскага. І толькі дзякуючы таму, што я аб гэтым прасіў, вёска Кухцінцы і па сягоньняшні дзень чакае на сваю калею не раскамасаваная. І тут крыюцца характэрныя адносіны: калі-б я прасіў не скамасаваць, то тады пан Камісар зрабіў-бы наадварот і падзяліў-бы вёску ў тым-жа годзе.

Каб паказаць, панове судзьдзі, якая справядлівасьць пануе ў нас, прывяду адзін маленькі прыклад.

Калі кам. Скальскі рабіў у мяне асабістую рэвізію, то забраў браўнінг. Амаль у той самы час была рэвізія ў доме майго бацькі, дзе найшлі кабуру і шэсьць патронаў ад гэтага рэвальвэра, якія ляжалі разам з маімі рэчамі ў маёй шафе. І што-ж. Гэта-ж не далучылі сюды, а ўкаралі бацьку на 50 злотых.

А войты, панове судзьдзі?! Я прасіў сьледаваццеля дапрасіць хоць аднаго войта, або яго заступніка, які не назначаны старастам, а выбраны. Праўда, такіх мала, але усе-ж такі з пару чалавек можна было-б найсьці. Няха-бы яны сказалі, як уплывалі падаткі. І я пэвен, што стоіла-б толькі праўду сказаць, каб было зразумела, што Грамада не агітавала за неплачэньне падаткаў. Найлепшы прыклад гэтага ёсьць — паказаньні войта Буевіча з Язна, які ў сьледаваццеля, ня ведаючы ў чым справа, гаварыў, што не заўважыў, каб з паўстаньнем Грамады былі антыпанствовыя выступленьні, або агітацыя аб неплачэньні падаткаў. Але на судзе, панове судзьдзі, ён прыйшоў ужо добра падгатаваны і сказаў якраз наадварот, гэта значыць тое, што патрэбна было п. пракурору. Гэткія ўсе паказаньні назначаных войтаў; — такая іх праўда! Што тычыцца тварэньня баёвак у Докшыцкай воласьці, то яны паўсталі хіба ў выабражэньні Скальскага.

Лічу, што і тут п. Скальскаму не ўдалося, бо, як відаць, рабіў усё гэта на скорую руку і дзеля гэтага паставіў на чале іх бязногага чалавека — Смакілу, а яго памочнікам — 19 летняга хлапца. Апрача гэтага, упісаў да арганізатараў гэтых баевак адных старых дзядоў, з якіх Варанковічы, напрыклад, не належалі навет да Грамады. Да судовае расправы гэтых людзей я ніколі ня бачыў.

Некалькі слоў, панове судзьдзі, мушу сказаць аб паездцы ў Расею. Езьдзіў туды не адзін, а цэлай пасольскай экскурсіяй на чале з паслом Брылям. Пісаў аб Расеі толькі тое, што сам бачыў на ўласныя вочы, нічога не дабаўляючы і не адкідаючы. Зрэшта гэта самае, калі ня ляпей, напісалі паслы Брыль і Разумэк.

Панове судзьдзі! На заканчэньне мушу сказаць, што за сваё пасольства зрабіў 35 мітынгаў і быў на 7 зьездах. Да майго арыштаваньня ня меў ані воднага выданьня, у той час, калі на агульную лічбу паслоў, здаецца, каля 30% такія мелі. Аб тым, што ў часе сваіх прамоў я нічога антыдзяржаўнага не гаварыў, сьцьвярдзіў тут на судзе і сьведка Камароўскі.

Панове судзьдзі! З дзіцячых гадоў ня прывык ухіляцца ад адказнасьці. У працягу суду, як і ў мове пракурора, стараўся найсьці сваю віну і не нашоў. Калі-б, што зрабіў, то проста і заявіў-бы, што тое і тое зрабіў. Але гэтага не магу сказаць, бо не магу прызнаць сябе вінаватым у тым, чаго не рабіў. Не адмаўляюся ад „Грамады“, як таксама ніколі ня выракуся сваіх Кухцінцаў. Калі ў гэтым мая віна, то судзеце!

Панове судзьдзі. Не прашу тут ласкі, а хачу найці справядлівасьць. У імя гэтай справядлівасьці і гаварыў сваё апошняе слова.

Апошняе слова абв. Валошына.

Па абв. Мятле забірае слова абв. Павал Валошын. У сваей кароткай некалькі мінутнай прамове грам. Валошын падчырківае вагу маючага быць хутка абвўленым прыгавору для будучага пакаленьня і гісторыі. Ен зазначае, што, апрача суду людзкага, ёсьць і суд гісторыі, прыгаворы якога часта не згаджаюцца з прыгаворамі першага. Суд павінен памятаць аб гэтым і перад выясеньнем прыгавору разважыць уважна ўсё значэньне, якое ён будзе мець для прышлае гэнэрацыі.

Далей абв. Валошын зазначае, што галоўныя закіды, робленыя яму, адпадаюць. Справа рэвізыі ў яго памешканьні, даволі выясьнены і над гэтым ён ня будзе затрымлівацца. Абвінэньне ў тым, што ён вёў акцыю праўнае помачы палітычным вязьням, гэтак сама адпадае, бо гэта сьцьвярдзілася пад час судовай працэдуры. Застаецца толькі той закід, што ён вёў акцыю помачы ежай палітычным вязьням. Але акцыя гэта, як выясьнілі на судзе сьведкі навет з боку абвінавачаньня, нічога „wywrotowego“ ў сябе ня мела.

Наша хроніка.

Спэктаклі. 24 траўня і, роўна праз месяц, 24 чэрвеня с. г. стараньнем вучнёўскай моладзі Радашкоўскае Бел. Гімназіі былі зладжаны два спэктаклі. На першым паставілі: „На парозе справы“—камэдыя Астроўскага (пераклад з расейскага); на другім, разьвітальным: 1) „Антось Лата“—Я. Коласа і 2) „Пашыліся ў дурні“—Крапіўніцкага. Ня гледзячы на тое, што некаторыя вучні выступілі першы раз на сцэну, аднак, свае ролі згулялі вельмі добра. Асабліва талантлівай гульнёй адзначыліся: вучаніца VII кл. О. Цьвірка ды Пётра (VI кл.) і Арсень (V кл.) Арловы, апошні сваім камізмам насьмяшыў усіх да сьлёз.

Даход з абодвых вечарын у суме 126 зл. пайшоў на карысьць незаможных вучняў.

Завастрэньне забастоўкі ў Беластоку. Агульная сітуацыя валакнянай забастоўкі ў Беластоку значна пагоршылася. Канфэрэнцыя прамыслоўцаў і работнікаў не давяла ні да якага выніку. Прамыслоўцы станоўча адмовіліся павялічыць плату больш, як на 6 працэнтаў. Работніцкія дэлегаты асьведчыліся, што могуць зрэдукаваць свае жаданьні самае крайняе з 30 і 40 прац. на 20 і 30 працэнтаў.

Адначасна адбываліся нарады акружнай камісіі прафэсіянальных саюзаў з удзелам дэлегатаў 14 розных праф. саюзаў. Пастаноўлена абвясьціць у Беластоку генэральную забастоўку, калі гэтая валакнявая забастоўка не зьліквідуецца ў хуткім часе. Час абвяшчэньня генэральнай забастоўкі наразе не ўстаноўлены.

Гарадзкая Рада „аднамысна“ (!?) пастанавіла зьвярнуцца з „апэлям“ да ваяводы, каб ён „зрабіў уплывы на „strony“, з мэтай зьліквідаваньня забастоўкі, трываючай чацьверты тыдзень і нарушаючай нармальны бег гаспадарчага жыцьця гораду“. („Rplita“ 184).

Зьліквідаваньне забастоўкі. Надовячы закончылася доўгатрываўшая забастоўка ў Кальварыйскай шклянай гуце. Работнікі атрымалі належную залегласьць.

Відна, што жыве яшчэ лёзунг працоўных: „Барацьбой здабудзеш свае права“.

Арыштаваньне камуністычных агітатараў. На польска-радавай граніцы ў раёне Івянца затрымана за нелегальны пераход граніцы 14 чалавек, у тым ліку, як падае „Kur. Wil.“ у 143 нумары, 2 камуністычных агітатараў, высланых з Менска са спэцыяльнымі інструкцыямі.

Выкрыцьце дывэрсыйнай банды. Газэты падаюць, што 26 г. м. паліцыя выкрыла ў Беразеншчыне „радавую дывэрсыйную банду“. У сувязі з гэтым арыштаваны нехта Міхал Дварак і яшчэ 12 „асобаў“, якіх адразу-ж і пасадзілі ў вастрог.

„Kurjer Wil.“ у 143 нумары дадае яшчэ, што сьцьверджана, быццам дзеяльнасьць Дварака і яго таварышаў, быўшых пад беспасярэднім кіраўніцтвам камуністаў, зьвязана з акцыяй арганізацый, апэруючых на абшарах паўднёвна-ўсходніх ваяводзтваў.

Як вынікае са сканфіскаваных адозваў і нелегальных часапісаў, выкрытая арганізацыя пашырала сярод сваіх сяброў тэрорыстычны мэтад дзейнасьці, даючы ім адпаведныя інструкцыі“.

З Т-ва Бел. Школы.

Праца Гурткоў Т-ва Беларускае Школы.

× 18/III 1928 г. Гуртком Т-ва Белар. Школы у в. Баравікі, быў наладжаны спэктакль-вечарына. Ставілі: 1) „Страхі жыцьця“ драма Ф. Аляхновіча і „Боты“. Тое-ж самае паставілі і ў в. Падмошы, Жыравіцкае вол 22/VI 1928 г. Сцэны былі прыбраныя прыгожа, артысты згулялі свае ролі вельмі добра, так-што глядзельнікі былі вельмі здаволеныя. Пасьля спэктаклю дэклямавалі вершы.

Чэсьць і слава маладым барацьбітам за вызваленьне з цемры роднае Бацькаўшчыны!

× 16/IV і 17/IV г. г. былі наладжаны 2 спэктаклі ў в. Пяшчаны, Беластоцкага пав. На першым так і на другім спэктаклю было вельмі шмат народу. Чысты даход у суме 70 злотых разьмеркавалі так: частка пайшла на адбудову сцэны, 5 зл. на незаможных вучняў Віл. Белар. Гімназіі, пазастаўшыя грошы пайдуць на адкрыцьцё курсаў дарослых пры нашым Гуртку Т-ва і на 2 вучняў, якіх мы пасылаем у беларускія гімназіі.

× Прабудзілася ўрэшце моладзь і вёскі Вялікія-Бярозаўцы, Лідзкага пав., ды ўзялася за працу, пачала шукаць лепшай будучыні. Арганізавалі Гурток Т-ва Бел. Школы, у якім ёсьць 17 чалавек. І, ня гледзячы на нядбаласьць некаторых сяброў, праца ідзе наперад. Гэтак 17 чэрвеня г. г. наладзілі спэктакль, дзе адыгралі „Лекары і лекі“ і „Атрута“. Даход пайшоў на выпіску кніжак.

Дык дружна працуйма, сябры, бо толькі так здолеем перамагчы цемру.

Падзяка.

Гурток Т-ва Белар. Школы ў в. Мікалаеўшчыне, Дзевяткаўскае вол., Слонімскага пав., складае шчырую падзяку грамадзянам: Янцы і Максіму Масьцеркам, Рыгору Весялусе, Тамашу Курыловічу, Мікалаю Масьцерцы, Янцы Весялусе за ахвяраваныя імі кніжкі ў ліку 65-ці ў бібліятэку чытальню Мікалаеўшчынскага Гуртка.

Управа Гуртка.

Карэспандэнцыі.

З панскага роду.

(Вёска Грабовец, Лубінскае воласьці, Бельска-Падляскага павету).

У нашай вёсцы жыве нейкі пан Жэлязны, які служыць у гміне, як заступнік сэкратара. Ен часта напіваецца, як „дрызіна“, выганяе сваю жонку і дзяцей ды нападае на сялян.

17-VI 28 г. у нашай вёсцы адбываўся сход, на якім абгаварваліся патрэбы вёскі і дзе раздаваў солтыс розныя „паперы“. Сюды прыйшоў гэты самы „ўжэндовец“ і пачаў крычаць, каб замкнуць нам, сялянам, горла, калі-ж мы запратэставалі, дык ён абзываў „камуністамі“, „бальшавікамі“, „жэ я вас выстшэлям до еднэго“ і г. д.

Дык вось, якіх маем „ужэндоўцаў“. Хто-б падумаў вар'ят, а сапраўды: „zastępca sekretarza gm. Łubin, pan Żelazny“.

Прысутны.

Каму патурае.

(в. Іванкавічы, Моўчадзкае гм.).

Наш солтыс Сьц. Гэрман за тры гады солтыства шмат каму ўеўся ў косьці. Але такі прыйшоў канец. 1/V прыехаў да яго сэквэстратар і ў нашага солтыса не хапае 1.300 злотых. Не дарма-ж з ім розныя „ulubieńcy świata dzisiejszego“ хэўру заводзілі.

Радуйся, пане Сьцяпане, не адзін ты гэтакі ёсьць.

Малады.

Пара апомніцца.

(Усялюбская гм.).

У вёсцы Крываногава ня так даўно была наладжана „вечарынка“ ў хаце Він. Ганчарыка. За тое, што ён пазволіў у сваёй хаце зрабіць такую гульню, „удзячная“ хлопцы зрабілі яму дзьве лысіны на галаве, якія і да сёньняшняга дня яшчэ не загаіліся, у дадатак выбілі 7 шыб.

Пара, браты, апомніцца ды кінуць п'янства і разбой! Вазьмеце прыклад з вёскі Зянеўшчына і Нанібак, дзе заложана культурна-асьветная ўстанова і ідзе праца на агульную карысьць.

В. Чаромха.

Словы і чын.

(Маладэчанскага пав.).

Пан Стараста Маладэчанскага пав., раз'яжджаючы па гмінах свайго павету ў часе выбараў у самаўрады, у Палачанскай вол., у сваёй прамове так гаварыў: „Усім палітычным арганізацыям ня дам разьвіцца. Прэч палітыку, бо яна дзеліць (працірае вочы — *Рэд.*)! Культурным установам заўсёды буду йсьці на спатканьне, бо культура злучае. Гэта словы, а чын? Калі Гурток Т-ва падасьць просьбу аб дазволе на спэктакль, то Стараста адказвае, што п'еса не падпісана камісарам Вільні, або нічога не адказвае. Аднаго разу Управа Гуртка паслала да дазвол і, калі яго доўга ня было, прымушана была (трацячыся матар'яльна) гаварыць праз тэлефон. І гэтак даведацца, ці ёсьць дазвол, ці не. Тады прыходзіцца яшчэ бегаць на пастарунак, які часам не згаджаецца паверыць, што ёсьць дазвол.

Дык дзе-ж тут ход „на спатканьне“?

Несьцярпеўшы.

З нашага жыцьця.

(в. В-Кракотка, Слонімскага пав.).

Дзякуючы надзвычайным высілкам паасобных сялян, у нас з'арганізавана бібліятэка-чытальня, якая мае блізу паўтысячы кніжак; за гэты год наладжана 9 спэктакляў, якія абслужылі да 20 тысячаў глядзельнікаў; арганізаваны сялянскі каапэратыў і сьмела можам сказаць, што гадоў праз пару будзем мець і Народны Дом! Здальнейшых дзяцей пасылаем у беларускія гімназіі. Цяпер вучыцца ў гімназіях чатырох хлапцоў і дзьве дзяўчыны. Але да гэтага часу ня маем беларускае пачатковае школы. Яшчэ перад выхадам у сьвет языковых уставаў, два гады пісалі прыгавары аб адчыненьні прыватнае беларускае школы і цяпер ніводнага году не прапусьцілі, каб не падаць школьнаму інспэктару дэкларацыяў на 50 — 60 дзяцей школьнага веку, а у гэтым годзе падалі на 68 дзяцей, але да гэтага часу ня маем беларускае школы. На мяшаную-ж школу (ўтраквістычную) мы ніколі ня згодзімся, бо люднасьць у нас чыста беларуская.

Праўда, кожны год пасьля падачы дэкларацыяў бываюць „баданьні“ школьнага інспэктара, пасьля якіх быццам частка дэкларацыяў уневажняецца, але і пасьля баданьня „zbadane“ бацькі падавалі праз Галоўную Управу Т-ва Белар. Школы пратэсты, што як ад падпісу на дэкларацыях так і ад беларускае школы ніколі не адмаўляліся.

Вось абразок з нашага жыцьця.

Свой.

Што гэта робіцца?

5-V 28 г. кіраўнік школы паўшэхнай с. В.-Жухавічы, Стаўпецкага пав., пан Бранкевіч паклікаў сялян з в. М.-Жухавічы, дзеці каторых ходзяць у яго школу і прапусьцілі колькі „лекцый“, каб сьпісаць на іх пратакол, пасьля каторага сказаў ім: „летась вы злажылі дэклярацыі на ператварэньне існуючай у вас польскай школы ў беларускую — дэклярацыі вашы прыняты і пан Інспэктар абяцаў з новага школьнага году яе ператварыць, але цяпер просіць, дый я таксама з свайго боку прашу, усіх дэклярантаў злажыць нанава дэклярацыі — і выдаў ім 16 штук „дэклярацыяў“, — „а рэштку атрымаеце ад свайго nauczyciela п. Язьвінскага. Толькі зрабеце гэта, як мага хутчэй“, і адпусьціў сялян. Адзін з сялян зьвярнуўся з гэтаю „дэклярацыяй“ да грам. М. Я. з запытаньнем, „што рабіць, ці не падлог тут які? Той, прагледзіўшы „дэкляраныю“, якая з вонку нічым не адлічалася ад праўдзівай нашай, заўважыў, што ёсьць „падлог“ і паказаў селяніну „дэклярацыю“, гдзе заместо слова „беларускае выкладовае мовы“ было „дзяржаўнае выкладовае мовы“.

Перасьцерагаю ўсё беларускае грамадзянства ад падобных „дабрадзеяў“ — Бранкевічаў і падобных дэклярацый; пільна і ўважна ўглядайцеся ў кожную паперку.

Дружна з неаслабленай энэргіяй, усе, як адзін, пачнем складаць у гэтым годзе дэклярацыі на нашу роднаю школу, а ўсялякую праяву падобна гэтай, будзем раскрываць і даводзіць да агульнага ведама праз нашу прэсу.

Вольны Шуляк.

З Радавае Беларусі.

Беларускі „Маладняк“ на Украіне.

Маладыя беларускія пісьменьнікі, згуртаваныя ў арганізацыі „Маладняк“ адведваюць на чале з Янкам Купалай Украіну. Пасьля адведзінаў Харкава, яны адправіліся ў Кіеў, куды іх запрасіў украінскі „Молодняк“ і дзе іх вельмі горача віталі ўкраінцы. „Маладняк“ маецца пабыць на Украіне 9—12 дзён і за гэты час азнаёміцца з культурным і эканамічным жыцьцём Украіны і адведае найбольшыя ўкраінскія ўстановы і памяткі. З Кіева, як сказаў прамоўца арганізацыі, Барашка, „Маладняк“ паедзе на магілу Шэўчэнка, а отуль на ўкраінскую вёску, дзеля рэальнага азнаямленьня з ею.

„Маладняк“ запрасіў украінскіх пісьменьнікаў адведаць Радавую Беларусь.

× „У Бабруйскім раёне арганізаваны ў апошнім часе 22 малачарні“.

× „10-га чэрвеня адчынены ў Менску паўторныя вучыцельскія курсы, на якія зьявілася 600 вучыцялёў“.

Паштовая скрынка.

Беларусу. Шмат ёсьць яшчэ несьвядомых беларусаў, якія выракаюцца ўсяго роднага, таксама як і ваш зямляк М. Шкута і дзейнасьць іх ужо асуджана яго народам. Ен ня варт, каб спэцыяльна аб ім карэспандэнцыі друкаваць. Пішыце што небудзь з жыцьця работніцкае Варшавы—будзем зьмяшчаць ахвотна.—**Сяргею Бялайцу.** Вашае апавяданьне да друку ў нашай газэце не падходзіць. Вітаем вашае „ацьвярозеньне“, — адыход ад „Беларускага Дня“ (ўжо памёршага) і „Грамадзяніна“, і што вы нарэшце „з іх палітыкай, як і ўсе праўдзівыя беларусы, ня маеце нічога супольнага“. Дастаць ганарар ад нас немагчыма, па-першае, што ваш твор да друку не падыходзіць, па-другое, што нашыя супрацоўнікі працуюць больш ідэйна. Плаціць за кожнае слова могуць „Бел. Дні“ ды розныя „Грамадзяніны“: іх купляюць і яны купляюць.—**Зорнаму.** Спэцыяльных запісаў карэспандэнтаў ня робім. Лічым, што абавязкам сьвядомага барацьбіта за працоўны народ ёсьць пісаньне аб усім у сваю газэту. Прысылайце карэспандэнцыі—будзеце нашым карэспандэнтам. — **Бому.** Ад вас карэспандэнцыі атрымлівалі, давалі адказы і друкавалі іх. Пашукайце. Вершы вашыя пайшлі на разгляд у рэдакцыю маючай зараз выйсьці новай часопісі. Добра было-б, каб вы іх пісалі на асобным аркушу паперы. **Падп. № 3560.** Апошнюю кар. „Рада напр.“ зьмесьцім з папраўкамі, якія вам пакажуць „у чым трэба паправіцца“, інакшай мы, ня можам паказаць „абмылку“. Папярэднія карэсп. будзем па магчымасьці зьмяшчаць.—**Голубу, Салавейцы, „Галы-Скону“, з пад Войстама, Я. Няшчаснаму, Бараноўскаму, Любчанскаму.**—Скарыстаем.

Ад Віленскае Беларускае Гімназіі.

На падставе атрыманых распараджэньняў, прыймо ў Гімназію новых вучняў можа адбыцца ўвосені толькі з дазволу Куратарыуму. Усе просьбы адрэсуюцца на імя Куратарыуму Віленскага Школьнага Вокругу, але прысылаць іх, разам з дакумэнтамі, трэба ў **Дырэкцыю Гімназіі і не пазьней 10 жніўня г. г.**

Хто перарос вымаганую норму, той ня можа быць прынятым у Гімназію. У I кл. прыймаюцца ад 9½ да 12 гадоў, у II ад 10½ да 13 гадоў, у III ад 11½ да 14 г. і г. д.

У інтэрнат пры Гімназіі будуць прыймацца толькі хлапцы малодшых клясаў (I—IV кл.) з платаю за ўтрыманьне ад 50 да 60 зл. у месяц, пры сваім адзеньні і бялізьне. (Гэта не адносіцца да стыпэндыятаў).

За падробнымі спраўкамі зварочвацца ў Канцэлярыю Гімназіі.

Дырэкцыя.

Рэдактар-Выдавец: Ал. Клаўсуць.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.